1. Lauretis, T. Technologies of Gender: Theories of Representation and Difference / T. Lauretis. – Indiana: University Press, 1987. – 149 c.

2. Национальный план действий по обеспечению гендерного равенства в Республике Беларусь на 2017 – 2020 годы: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 17 февр. 2017, № 149 // Национальный правовой Интернет–портал Республики Беларусь. – 24.02.2017. – 5/43382.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ляшкевіч А.У.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Раманенкава В.І.

## НАРОДНА-ПЕСЕННЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Народная культура – найважнейшая частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Народ заўсёды выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультурных традыцый, якія ён беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы як сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам.

Важным відам народнай творчасці з‘яўляецца народная музыка. Музычны фальклор – аснова нацыянальнага музычнага стылю, вызначальная крыніца прафесійнай кампазітараскай музыкі і канцэртнай творчасці прафесійных і самадзейных музычных калектываў. Носьбітамі беларускай народнай культуры з‘яўляліся і з‘яўляюцца народныя спевакі, народныя музыканты, народныя інструментальныя ансамблі. Вядучае месца ў беларускай музычнай культуры займае песенная творчасць, якая ахоплівае некалькі вялікіх гістарычных пластоў. Песенная творчасць беларусаў адметная разнастайнасцю і багаццем мясцовых традыцый. Традыцыі выяўляюцца і ў перавазе пэўных песенных жанраў у пэўных этнаграфічных зонах, і ў мясцовай стылявой

афарбоўцы агульнапашыраных жанраў, і ва ўласна меладычных асаблівасцях напеваў [6, с.1–2].

Навукоўцы вылучаюць разнастайныя групы традыцый, якія з‘яўляюцца характэрнымі рысамі таго ці іншага прадмета або з‘явы, напрыклад нацыянальныя традыцыі, рэлігійныя, сацыяльна-культурныя, бытавыя і іншыя. У тым ліку і народна-песенныя традыцыі.

Такім чынам, народна-песенная традыцыя – гэта сукупнасць умоў існавання, рысаў стылю і прыёмаў выканання, якія надаюць своеасаблівасць і характэрныя адметныя ўласцівасці песеннага фальклору пэўнага народа ў адной абмежаванай мясцовасці (рэгіёне).

Характэрнымі рысамі беларускай народнай песеннай традыцыі з‘яўляюцца: лінеарнасць, як аснова музычнага стылю мыслення ў фальклоры беларусаў; прынцыповая манодыя раннетрадыцыйнай класікі беларускіх песень; разгорнутая мелізматыка, ―гнуткасць” голасавядзення мелодый народных песень; пачатковыя элементы паліфаніі ў спеўных стылях: гетэрафонія, бурдон, падводка; маўленне як крыніца этнічных спеваў; арфаэпіка мовы, яе ўплыў на асаблівасці этнічных спеваў; натуральнасць і глыбіня розных дыялектаў беларускай мовы; гуказдабыванне ў высокім рэгістры (ротаглотачнае рэзаніраванне) і ў сярэднім рэгістры (грудное рэзаніраванне); розныя прыёмы агаласоўкі ў спевах [7, с.8–9].

Паводле І.В. Мазюк існуюць наступныя формы народна-песеннай традыцыі:

— гуртавы спеў (у час каляндарных і сямейных абрадаў, кірмашоў, бяседы, гасціны, супольнай працы, адпачынку, у карагодзе, падчас гульні);

— спеў у дваіх (за працай, ―за каровамі”, у час адпачынку);

— сольны спеў (гучны; спеў ―для сябе”; за працай, у дарозе, над калыскай, у іншай жыццёвай сітуацыі);

— спеў у жаночым, мужчынскім ці змешаным выкананні (асобна існавалі ―хлапечыя”, ―маладзецкія” песні);

— спеў з інструментальным суправаджэннем [3,с.218–219].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Непасрэдна сама народна-песенная традыцыя Беларусі яскрава праяўляецца ў выканальніцкай манеры шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паазер‘е, Падняпроўе, Панямонне, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Цэнтральная Беларусь.

Песенная культура Паазер‘я мае глыбокія агульнаславянскія традыцыі і разам з тым носіць свой непаўторны лакальны каларыт. Перш за ўсё культура гэтага рэгіёна цалкам манадыйная, заснаваная на лінеарным мысленні. У музычным побыце паўночных раёнаў Беларусі пануюць адзіночныя, альбо сумесныя спевы ва ўнісон. Мелодыя песень роўная, з плаўнымі пераходамі, напевы нетаропкія і свабодныя. Толькі ва ўсходніх раёнах, якія знаходзяцца побач з Магілёўшчынай, выяўляюцца нязначныя гетэрафонныя расслаенні галасоў, і ў заходніх раёнах, якія побач з Гродзеншчынай, час ад часу, пераважна ва ўмоўна прымеркаваных і непрымеркаваных лірычных песнях, праяўляюцца элементы шматгалосся. У станаўленні меладычнага стылю традыцыйных песень Паазер‘я выступаюць дзве тэндэнцыі: тэматычная сцісласць, і, з другога боку, свабода распева, часам сапраўдны меладычны разліў [4, с.143–144]. Побач з агульнабеларускімі каляндарна-земляробчымі і сямейна-абрадавымі песнямі прыкметнае распаўсюджанне атрымалі тут тыя жанры, якія ў іншых рэгіёнах маюць абмежаваны арэал або зусім невядомыя – валачобныя, масленічныя, талочныя, ільнаробчыя і ярынныя песні [6, с.272].

Народныя гаворкі Падняпроўя вызначаюцца сваёй рэгіянальнай дыялектнай структурай. Што даволі выразна адлюстроўваецца ў іх багатай мясцовай лексіцы і фанетычным гучанні, наяўнасці мяккага –р”, канчаткаў –іць”, –ыць” дзеясловаў цяперашняга часу; яны ўтвараюць усходнемагілёўскую групу з пераходам на поўдні да сярэднебеларускіх гаворак. Рэгіянальнымі асаблівасцямі вылучаецца і традыцыйная аграрна-каляндарная абраднасць, і шматжанравая фальклорная творчасць. Сэжэтна-абрадавае афармленне каляндарных свят мае мноства лакальных варыяцый, што адлюстроўвае багатую палітру, шырокі дыяпазон вусна-паэтычнай творчасці. У песнях гэтага рэгіёну захавалася мноства старажытных язычніцкіх матываў, міфалагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобразаў і сюжэтаў (гуканне вясны, гулянні моладзі ў купальскую ноч, пахаванне стралы) [6, с.279].

Спеўная традыцыя Панямоння – шматгалосная, як часам пазначаюць, пад уплывам гамафонна-гарманічных касцёльных спеваў. Для песеннай культуры Панямоння характэрна дамініраванне познетрадыцыйнага пласта народна-песеннай класікі. У параўнанні с іншымі рэгіёнамі тут бядней прадстаўлены раннетрадыцыйны абрадавы пласт (вясенні, летні, сямейна-абрадавы). У спевах Панямоння пераважае вакальны тып інтанавання, пры ненапружаным, часам, мікставым змыканні галасавых звязак у сярэднеязычнай і пярэднеязычнай пеўчых пазіцыях. Суладдзе галасоў пад час спеваў адбываецца ва ўнісонна-гетэрафонным стылі [2, с.5–22].

Даследчыкі XIX–XX стст. заўсёды адмяжоўвалі культуру Палесся ад астатняй беларускай традыцыі, адзначаючы яе самабытнасць. Яе асаблівасці маюць падобныя рысы ў беларускім, украінскім і рускім Палессі. Гучныя спевы беларускіх палешукоў – узор шматгалоснай традыцыі – але прадстаўлены ў традыцыйных стылях адзіночнага і сумеснага спеваў. У стылі гуртавых спеваў выдзяляюць дзве асобныя формы: спевы ўнісонна-гетэрафоннай і шматгалоснай („з падводкай”) традыцый. Ва Усходнім Палессі гетэрафонны стыль спеваў прадстаўлены полірытмічным тыпам манодыі. Пры выкананні аднагалосных напеваў „гуртом” гетэрафонныя адхіленні ад унісону ўтвараюцца ў выніку музычна-рытмічнага вар‘іравання асноўнага напеву кожным спеваком. Мелодыка песень Заходняга Палесся менш арнаментавана і гетэрафонны стыль рэгіёна заснаваны на элементах бурданіравання з дакладным усведамленнем народнымі спевакамі вертыкалі. Гэты стыль вызначаецца як дыяфонія на бурдоннай аснове. Для выканання пазаабрадавых лірычных песень Палесся характэрныгетэрафонны стыль, які Л.С. Мухарынская шанавала як імправізаванае „рознагалоссе” – спевы з пераліваам. Другі адметны для Палесся стыль выканання – шматгалосныя „спевы з падводкай”. Харавая партытура шматгалосных песень Палесся складаецца з дзвюх абавязковых партый з дакладнай дыферынцыяцыяй іх мастацкіх функцый. Асноўны напеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выконваецца хорам у ніжнім голасе, які ў працэсе шматгалоснага распева песні гетэрафонна вар‘іруецца, а верхні саліруючы голас ―спаборнічае” – кантрапунктуе харавому ніжняму. Спевы з падводкай адметныя моцнай ―галоснай”, ―адкрытай”, ―шырокай” падачай гуку, акцэнтнай арнаментацыяй [5, с.6–10].

Што тычыцца вызначэння традыцыйных этнафанічных і музычна-стылістычных прыкмет Цэнтральнай Беларусі, то варта абазначыць дамінуючае сярод беларускіх фалькларыстаў меркаванне: ―Цэнтральнага этнаграфічнага рэгіёну” не існуе, і яго традыцыйную культуру варта разглядаць як зону ―на скрыжаванні” рэгіянальных культур суседніх этнаграфічных рэгіёнаў. У спеўнай традыцыі Цэнтральнай Беларусі сустракаюцца манодыя, шматгалоссе і гетэрафонія. Такім чынам Міншчына не ўяўляе сабой замкнёны культурны рэгіён, а збірае ў сабе розныя этнакультурныя традыцыі, у асобных арэалах – у іх скрыжаванні і ўзаемапранікненні [1, с. 3–7].

Такім чынам, кожны этнаграфічны рэгіён Беларусімае свой непаўторны каларыт і этнафанічныя рысы, якія вылучаюць іх у агульнабеларускім масіве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Трад. жанры: Мінск. вобл. /Уклад.В.Д.Ліцвінка; Уклад. муз . часткі Г.Р.Кутырова. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

2. Варфаламеева, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння /Нац. акад. навукБеларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн. : Беларускаянавука, 1998. – 287 с.

3. Мазюк, І.В. Народная песенная творчасць / І.В. Мазюк // Даследаванне лакальных культур Беларусі: Праграмы па зборы фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў / Навук. кіраўн. праекта, агул. рэдагаванне: Т.Б. Варфаламеева. Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – с. 218 – 238.

4. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт систем. – типол. Исслед. – Мн. : Наука и техника, 1985. – 247 с.

5. Можейко, З.Я. Песни Белорусского Полесья.Вып.1 – М.,1983. – 185 с.

6. Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / Пад агульнай рэдакцыяй В.С.Цітова. Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2002. – 431 с.

7. Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію : вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) / [склад.: Э. В. Шчадрына, В. В. Калацэй ; сярод рэц. Л. Л. Ражкова]. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 14, [1] с., уключ. вокл.: табл.; 20х15 см. – Бібліягр.: с. 12-13 (18 назв.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Магілеўцава Н.С.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Бязмен С. Г.

## ПАРАЎНАННЕ МОЎНЫХ КАРЦІН СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ І АНГЛІЧАН

На сённяшні дзень адным з актуальных накірункаў у культуралогіі і лінгвістыцы можна назваць параўнальнае даследванне розных моў. Патрэба ў такім аналізе ўзнікае пры супастаўленні лексічных адзінак падчас межкультурнай камунікацыі або дакладнага перакладу пісьмовых тэкстаў, што пабуджае спецыялістаў у сферы міжнародных адносін вывучаць асаблівасці лінгвістычных канцэптаў розных народаў. Кожная мова свету мае нацыянальную спецыфіку, складзеную з традыцый у арганізацыі камуніктыўнага працэсу, норм этыкету, сімвалізму ў сацыяльных паводзінах. Яна праяўляецца ў граматычных формах, катэгорыях і інтэрпрытацыі рэчаіснасці ў цэлым.

Паняцце моўнай карціны свету адносіцца да ліку фундаментальных, бо яно з‘яўляецца вынікам актыўнасці чалавека, усіх яго кантактаў і